# СУЧАСНАЯ МЫТНАЯ ГЕРАЛЬДЫКА БЕЛАРУСІ

*В. А. Астрога[1], Г. А. Астрога [2]*

*[1] Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр. Незалежнасці, 220030, г. Мінск, Беларусь,* *ostroga.v@mail.ru*
*[2] Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр. Незалежнасці, 220030, г. Мінск, Беларусь,* *halina. mail @mail.ru*

Аналізуецца гісторыя і сучасны стан развіцця агульнаеўрапейскай і нацыянальнай мытнай геральдыкі, якая абдымае геральдычныя знакі дзяржаўнай мытнай службы і разнастайных навучальных і грамадскіх інстытуцый (кафедраў мытнай справы ўніверсітэтаў Беларусі, Рэспубліканскага саюза удзельнікаў мытных адносін). Разгледжаны геральдычны сэнс асноўных элементаў мытнай геральдыцы – кадуцэй і ключ. Даследуецца значэнне прыборных колераў мытнай геральдыцы – зялёнага і жоўтага. Характарызуецца гісторыя зменаў ў геральдыцы мытных органаў Рэспублікі Беларусь. Выказваецца дыскусійнае меркаванне аб існуючых гербах сучасных беларускіх мытняў. Робіцца выснова, што на сённяшні дзень увесь існуючы комплекс беларускай мытнай геральдыкі ў цэлым адпавядае традыцыйным геральдычным канонам і працягвае свае развіцце па-за межамі геральдычных знакаў дзяржаўнай мытнай службы.

***Ключавыя словы:*** мытная служба; сімволіка; геральдыка; кадуцэй; ключ; прыборныя коляры.

# MODERN CUSTOMS HERALDRY OF BELARUS

*V. A. Ostroga[a], G. A. Ostroga[b]*

*[a] Belarusian State University, Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Belarus*
*ostroga.v@mail.ru (corresponding author)*
*[b] Belarusian State University, Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Belarus*
*halina.mail@mail.ru*

The article analyzes the history and current state of the development of pan-European and national customs heraldry, which covers the heraldic signs of the state customs service and various educational and public institutions (departments of customs affairs of Belarusian universities, the Republican union of participants in customs relations). The research considers the heraldic meaning of the main elements of customs heraldry – the caduceus and the key. The significance of instrument colors in heraldry – green and yellow – is determined. The article describes the history of changes in the heraldry of the customs authorities of the Republic of Belarus. A controversial opinion is expressed about the existing coats of arms of modern Belarusian customs. It is concluded that today the entire existing complex of Belarusian customs heraldry generally corresponds to the traditional heraldic canons and continues its development beyond the heraldic signs of the State customs service.

***Key words***: customs service; symbols; heraldry; caduceus; key; instrument colors

Сучасная беларуская мытная геральдыка мае глыбокія гістарычныя карані, цесна звязана са старажытнымі еўрапейскімі традыцыямі. Аднак даследаванні ў гэтай сферы фактычна адсутнічаюць. Маецца толькі некалькі публікацый, дзе ў большай ці меншай ступені разглядаецца эвалюцыя беларускай мытнай геральдыкі: Дзянісаў І.В., Астрога В.А., Саяпін В.Ю.



Вядома, што першым геральдычным знакам мытнікаў на беларускіх землях была эмблема мытнай службы ВКЛ – дзяржаўны герб «Пагоня» на тле дзвух скрыжаваных ключоў. Яна была зацверджана 11 студзеня 1768 г. Эканамічнаю Радаю Скарба ВКЛ [1, с. 281].




Пасля здабыцця Беларуссю дзяржаўнай незалежнасці, 10 ліпеня 1992 г. Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь «Аб забеспячэнні работнікаў мытнай службы Рэспублікі Беларусь і спецыяльнай форменнай адзеннем і абуткам», беларускія мытнікі атрымалі нацыянальны геральдычны знак. Ён быў на тарчы авальнай формы і на ім на светла-зялёным фоне размяшчалася выява дзяржаўнага бел-чырвона-белага сцяга, на доле абрамленага дубовымі лісцем. Аблямоўвала эмблему стужка з надпісам: «МЫТНЯ-БЕЛАРУСЬ-CUSTOMS».




Пасля змянення дзяржаўнай сімволікі Беларусі, 19 студзеня 1996 г. пастановай Савета Міністраў № 48 была прынята новая мытная эмблема на тарчы сіняга коляру, якая кампазіцыйна нагадвала сімволіку мытнай службы СССР узору 1991 г.




У год юбілею беларускай мытнай службы Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 2 сакавіка 2001 г. у мэтах «захавання і развіцця гістарычных традыцый мытных органаў» быў зацвержаны новы геральдычны знак-эмблема – перакрыжаваныя кадуцей і ключ залацістага колеру на тарчы цёмна-зялёнага коляру. Эмблема стала падставаю для новага ўзору адзінага нарукаўнага знака, далейшых праектаў нарукаўных знакаў мытняў. Беларускія мытнікі ў якасці ведамаснай эмблемы зноў атрымалі сусветна прызнаны класічны мытны знак з выявай кадуцэя і ключа.

Геральдычны знак мытных органаў Рэспублікі Беларусь узору 2001 г. лаканічна і дакладна адлюстроўвае сутнасць і спецыфіку дзейнасці мытнай службы – мытны кантроль над знешнеэканамічнай дзейнасцю.

Неабходна адзначыць, што Кадуцей (кій) абвіты двума змеямі і увянчаны крыламі Меркурыя (жазло Меркурыя) з'яўляецца найважнейшым складовым элементам сімволікі мытных службаў многіх краін свету, у першую чаргу еўрапейскіх, хоць падобны сімвал выкарыстоўваюць і мытнікі такой азіяцкай краіны як Кітай. Мытныя органы ўсіх сумежных Беларусі дзяржаў у якасці свайго асноўнага сімвала таксама абралі кадуцей: Расія –скрыжаваны кадуцей і паходня, Украіна – два скрыжаваныя ключы і кадуцей, Польшча – кадуцей з шапкай Меркурыя, Літва і Латвія – два скрыжаваныя кадуцэя. Дзясяткі іншых краін розных кантынентаў таксама выкарыстоўваюць кадуцей у геральдыцы сваіх мытных ведамстваў [2, с. 24].

Варта падкрэсліць, што кадуцэй трэба адрозніваць ад «кія Асклепія», атрыбута старажытнагрэчаскага бога лекараў – Асклепія. Ён уяўляў сабой кій, абвіты адной змяёй.

Кадуцей (грэч.: Karykeion, лац. Caduceator – парламенцёр, перамоўшчык) – сімвал старажытнагрэцкага бога Гермеса (у старажытнарымскай міфалогіі – бога Меркурыя), вясніка багоў, апекуна вяшчальнікаў, паслоў, гандлю і падарожнікаў і інш. У руцэ Меркурый трымаў кадуцей, чароўны кій, які адчыняў яму ўсе шляхі і ўлагоджваў сустрэчных. Сімвал гэты вельмі старажытны, знойдзены археолагамі ў Індыі на каменных таблічках перад старажытнымі храмамі, а таксама ў Міжрэччы (Блізкі Усход).



Вядомая старажытнагрэцкая легенда аб паходжанні жазла. Калі Гермес наўзамен чароўнай жалейцы атрымаў ад Апалона жазло пакою – залатый кій, то адразу вырашыў выпрабаваць яго. Азірнуўшыся, ён убачыў дзвюх змей, якія біліся паміж сабою і прасунуў паміж імі кій. Змеі адразу супакоіліся і зліліся разам (у старажытнарымскай легендзе змеі ўвасаблялі Юпітэра і Рэю, якія былі супакоены Меркурыем пасля сваркі). Хоць паводле падання, кій пасланца багоў першапачаткова упрыгожваўся замест змеі трапяткімі стужкамі альбо ўяўляў дубчык, абвіты вінаградными лозамі, плюшчом

(найстаражытная эмблема пакою). Кадуцей стаў валодаць уласцівасцю нейтралізаваць гнеў, таму служыць эмблемай пасярэдніцтва, пакою і згоды.

У Старажытным Рыме кадуцей канчаткова ператварыўся ў атрыбут бога гандлю і прыбытку Меркурыя. Само імя Меркурый паходзіць ад лацінскага слова «мерка» (тавар). Меркурыя ў асноўным шанавалі гандляры, якія крапілі сябе і свой тавар вадой з крыніцы на схіле Цэліева пагорка (Рым), прысвечанага Меркурыю. Рабілі яны гэта для таго, каб змыць з сябе грэх махлярства, дапушчанага ў гандлі. У гонар Меркурыя ў Рыме таксама быў узведзены вялікі храм.

Так склаўся сучасны геральдычны сэнс і знешні выгляд гэтага сімвалічнага жазла, які стаў у Новы час, асабліва пасля Вялікай Французскай рэвалюцыі, міжнароднай эмблемай гандлю, распаўсюдзіўшыся ў ХХ стагоддзі па ўсіх кантынентах нашай планеты.




Ключ як геральдычная эмблема вядома з найстаражытных часоў. У Бібліі ключ – сімвал ўлады і магутнасці, што знайшло, да прыкладу, адлюстраванне ў гербе дзяржавы Ватыкан. З часоў сярэднявечча ключ сімвалізаваў бяспеку. Да прыкладу, эмблема ключа ўносілася ў гербы амаль усіх гарадоў і крэпасцяў, ключавых у стратэгічным дачыненні населеных пунктаў (Барысаў, Ліда) або дзяржаў (Куба, Маўрыкій). Вядома, што па сумнай традыцыі пераможаны горад аддаваў ключы ад гарадской брамы пераможцу. Месцапалажэнне ключа таксама мае сваё значэнне. Ключы ў рэлігійнай сімволіцы абавязкова месцяцца бародкаю ўгору як ключы «нябесныя». У адрозненні ад іх, ключы бяспекі і кантролю малююцца бародкамі ў дол, што паказвае на справы зямныя.

У геральдычным знаку беларускай мытнай службы ключ азначае мытны кантроль, ўладную моц, якая адчыняе альбо зачыняе «Мытную браму» Беларусі, а бародка ключа ў выглядзе «М» паходдзіць ад пачатковай літары слова Мытня і падкрэслівае ягоную ведамасную і нацыянальную прыналежнасць.

Мытная служба Беларусі, акрамя свайго геральдычнага сімвала мае і геральдычныя (прыборныя) колеры – цёмна-зялёны і жоўты.

Варта пазначыць, што яшчэ ў старажытныя часы, тысячы гадоў таму, людзі імкнуліся спазнаць патаемны сэнс розных колераў. Яны надавалі ім сакральны сэнс і ўжывалі толькі ў пэўных выпадках і спалучэннях. Так на працягу стагоддзяў фарміравалася пэўная ўстойлівая, нягледзячы на сваю ўмоўнасць, каляровая сімволіка. У



сваёй практыцы яна здаўна і актыўна выкарыстоўвалася ў вайсковых і іншых форменных строях. З цягам часу з'явілася і такое паняцце як прыбор – сістэма вонкавых знакаў адрознення на форменным мундзіры. Зараз існуе металічны і суконны прыбор [3, с. 215].

Металічны прыбор – колер ўсіх металічных дэталяў мундзіра (гузікаў, спражак, армацюраў (петличных знакаў), цэшкі і г.д.). Колерам прыборнага металу можа быць жоўты (золата, медзь, латунь), белы (срэбра, сталь, волава, алюміній). Суконны прыбор – колер ўсіх каляровых суконных (гафтаваных) дэталяў мундзіра (атока, кантоў, прасветаў, армацюраў, нарукаўнага знака, нашывак і г.д.). У мытнай службе традыцыйны прыборны метал – жоўты (залацісты), а суконны прыбор – традыцыйны агульнаеўрапейскі (з XVIII ст.) – зялёны. Такім чынам, за яскравымі колярамі форменнай вопраткі, у тым ліку мытнай, хаваецца іх глыбокае геральдычна-сімвалічнае значэнне.

Каляровыя элементы форменнай вопраткі нясуць у сабе не толькі практычнае і эстэтычнае значэнне, але і вялікі сімвалізм. Разгледзім базавыя коляры сучаснай формы адзення беларускіх мытнікаў – цёмна-зялёны (зялёны) і жоўты (залаты).

Цёмна-зялёны (зялёны). Згодна хрысціянскай традыцыі, зялёны колер – сімвал Уваскрэшання і абнаўлення, у свецкім сэнсе – сімвал юнацтва, вольнасці, спакою, высакароднасці, гонару, ветлівасці, надзеі, багацця. Гэта колер надзейнасці і стабільнасці, сярэдзіны, пасярэдніцтва і дапамогі, як роўнааддаленымі ад блакіту нябёсаў, так і ад чырвані пекла. Колер заспакаяльны, колер сузіральнасці. Псіхалагічна нейтральны і выклікае пачуццё спакою. Біялагічна, з зямных фарбаў, найбольш прыемны, аптымальны і заспакаяльны псіхічна, ён нават рэгулюе артэрыяльны ціск. Невыпадкова зялёны абраны для афарбоўкі знакаў «Шлях вольны». У геральдыцы зялёны колер завецца «Вянера» (планета) або «верт» «vt».

Цёмна-зялёны прыборны колер мытнай службы Беларусі з'яўляецца колерам шмат якіх элементаў форменнай вопраткі, знакаў адрознення і адзнакі. Так, цёмна-зялёны колер мае аток фуражкі, што мае даўнюю гісторыю. Упершыню з'яўленне фуражкі з шэрага сукна з цёмна-зялёным атокам і светла-зялёнымі кантамі, можна аднесці да 1827 г. Іх насіла на той час расейская памежна-мытная варта

на заходняй мяжы імперыі. Цёмна-зялёны колер быў ведамасным для Міністэрства фінансаў Расійскай імперыі, нададзены яму ў 1819 г., а, як вядома, мытная (памежная) варта ўваходзіла ў склад Міністэрства.

Жоўты (залацісты), колер прыборнага металу мытнай службы перадае колер золата, багацця. У сувязі з «сонечнымі» асацыяцыямі (святло, цяпло, моц) і як колер найбольш блізкі да золата, жоўты часта сімвалізуе славу і ўладу, магутнасьць і багацце. У старажытным Кітаі гэта быў колер імператара. У часы апошняй дынастыі Цын (1644 – 1911 гг.) толькі імператар меў права насіць вопратку жоўтага (залатога) колеру. У многіх войсках свету, дзе прыняты срэбны (белы) прыбор металу, у генералітэта захоўваецца залаты прыбор. У геральдыцы жоўтым колерам пазначаецца золата, якое носіць назву «Сонца» або «or». Мытная служба Беларусі атрымала жоўты (залацісты) колер прыборнага металу з 1992 г., але залацісты колер быў асноўным прыборным колерам таксама і ў савецкай перыяд яе гісторыі.

Сёння элементы мытнай геральдыцы актыўна выкарыстоўваюцца пры распрацоўцы гербаў асобных беларускіх мытняў і інстытуцый, якія маюць дачыненне да мытнай сферы.

Так, сімволіка сучастнай мытні спалучаецца з мясцовымі геральдычнымі элементамі, з гербам вобласці, дзе знаходзіцца зона яе дзейнасці (Мінская рэгіянальная мытня (МРМ) і інш.), альбо як Мінская цэнтральная мытня (МЦМ) з гербам горада, дзе яна размяшчана. Але на наш погляд, гэта даволі дыскусійна, бо зараз ўсе мытні дыслакуюцца ў абласных цэнтрах. У гэтай сувязі нагадаем, што першапачаткова геральдычны знак МРМ усё ж меў у сваім складзе герб Мінска, як правапераемніцы Мінскай мытні [4].










А геральдычна адлюстраваць месцазнаходжанне іх пастоў можна, да прыкладу, з дапамогай іх гарадскіх гербаў. У сваю чаргу, МЦМ гэта спецыфічная тылавая мытня забеспячэння, а не галоўная ў Мінску, таму лепей было гэтую спецыфіку адлюстраваць на яе гербе, як і было раней.




Іншы прыклад уяўляе сабой геральдычны знак таксама спецыяльнай Мінскай аператыўнай мытні, у

цэнтры якога – фасцыі (звязак дубцоў) з сякерай, які ўяўляю сабой сімвал дзяржаўнай улады, сімвал органа, які мае права дамагацца выканання сваіх рашэнняў сілай. А ружа вятроў сімвалізуе магчымасць супрацоўнікаў гэтай мытні аператыўна і імкліва дзейнічаць па ўсіх кірунках, ва ўсіх рэгіёнах Беларусі.




Элемент геральдычнага знака мытнай службы ўзяў у свой геральдычны знак і нядаўна створаны Рэспубліканскі саюз удзельнікаў мытных адносін. У асяродку яго – кадуцэй, якога атачае лаўровы вянок, а таксама элементы нацыянальнай беларускай сімволікі. Сімволіка размешчана на круглай тарчы з зяленым (мытным) кантам.

Заслугоўваюць сваёй увагі і іншыя мытныя геральдычныя знакі, такія як эмблемы кафедраў беларускіх універсітэтаў, дзе рыхтуюцца будучыя мытнікі.

*Беларускі дзяржаўны універсітэт.*









[illegible]ве эмбл[illegible]едры мытнай справы БДУ ўзяты геральдычны знак мытнай службы, вакол якога колам размейшчана сіняя стужка колераў БДУ з надпісам на беларускай мове. Гэта месціцца на круглай зялёнай тарчы са стылізаваным крыжом з расчыненных кніг, сімвалам навучання. Эмблема кафедры размейшчана і на іншые яе сімвалах: нарукаўным знаку, эмблеме навучальнага кабінета «Эканамічная бяспека», студэнцкім нагрудным знаку.

*Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт.*




На існуючай эмблеме кафедры мытнай сіравы БНТУ знаходзяцца тры элементы: лагатып універсітэта, надпіс на рускай мове і геральдычны знак мытнай службы. Элементы месцяцца на прастакутніку светла-зялёнага коляру [5].

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт транспарту.*



На эмблеме кафедры мытнай справы БДУТ на зялёнай тарчы змешчаны геральдычны знак мытнай службы і галаўны ўбор і дыпломная грамата выспускніка як сімвал акадэміцкага навучання. У яе доле знаходзіцца стылізаваная выява «крылаў» Беларускай чыгункі, што пазначае прыналежнасць кафедры да спецыялізаванага ўніверсітэту [6].

*Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы.*



Спецыялістаў мытнай справы рыхтуюць на кафедры Міжнароднага права. Але гродзенскія студэнты-мытнікі маюць сваю ўласную эмблему. У асяродку чорнай круглай тарчы знаходдзіцца меншае кола белага, жоўтага і чорнага коляраў, на якім месціцца чырвоная тарча з выяваю мяча і вагаў, сімвалам юрыспрудэнцыі. Па краю іддзе белы налпіс [7].

Такім чынам, на сённяшні дзень увесь існуючы комплекс беларускай мытнай геральдыкі ў цэлым адпавядае традыцыйным геральдычным канонам і працягвае свае развіцце па-за межамі геральдычных знакаў дзяржаўнай мытнай службы.

БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ


1. Саяпин В.Ю. . Таможенная служба. Кн. 1. Мыто и мытники. Гродно. 2005.
2. Денисов И. Таможне – жезл Меркурия // Таможенный Вестник. 2001. №4.
3. Острога В.А. История таможенного дела и таможенной политики Беларуси. Минск. 2019.
4. Таможенная геральдика [Электронный ресурс] // Государственный таможенный комитет Республики Беларусь : [site]. [2020]. URL: http://www.customs.gov.by/ru/history-ru/ (дата обращения 02.03 2020).
5. Кафедра таможенного дела [Электронный ресурс] // Белорусский государственный национальный технический университет : [site]. [2020]. URL: http://www.bntu.by/ftug-td.html (дата обращения 02.03 2020).
6. Кафедра таможенного дела [Электронный ресурс] // Белорусский государственный университет транспорта : [site]. [2020]. URL: http:// https://www.bsut.by/university/faculties/gef/kafedry-fakulteta-2/kafedra-tamozhennoe- elo (дата обращения 02.03 2020).
7. Воспитательная и идеологическая работа на юридическом факультете

[Электронный ресурс] // Гродненский государственный университет : [site]. [2020]. URL: https://lf.grsu.by/index.php?option=com_content&view=article&id=286&Itemid=295 (дата обращения 02.03 2020).